Гражданское право нашего времени закрепляет норму, что перемена лиц в обязательстве не влечет изменения срока исковой давности и порядка его исчисления. Данное положение не было закреплено в римском частном праве.

Таким образом, следует отметить, что понятие исковой давности в римском частном праве Юстиниановского периода и в современном гражданском праве имело массу схожих признаков, но в деталях зачастую существенно отличалось. Современное гражданское право более глубоко и разносторонне трактует рассматриваемое понятие в связи с возникновением новых общественных отношений и усовершенствованной системой законодательства.

***А.І. Лябедзіч***

БДЭУ (Мінск)

# СУТНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ Ў ДЭКЛАРАЦЫІ АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ СУВЕРЭНІТЭЦЕ БССР ад 27 ліпеня 1990 г.

Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце стала, па сутнасці, першым актам на шляху замацавання дзяржаўнай самастойнасці нашай краіны, прадпрынятым Вярхоўным Саветам XII склікання.

Усведамленне неабходнасці дзяржаўнага суверэнітэту прыйшло да дэпутатаў не адразу. Першапачаткова ідэя суверэнітэту зыходзіла ад дэпутатаў, якія прадстаўлялі Беларускі Народны Фронт (БНФ).

У чэрвені 1990 г. БНФ правёў канферэнцыю «Незалежная Беларусь», на якой быў прыняты праект Дэкларацыі. Безумоўна, стымулам, падштурхнуўшым адпаведны працэс, стала Дэкларацыя аб суверэнітэце, прынятая Вярхоўным Саветам Расіі і Украіны. Такім чынам Дэкларацыі іншых савецкіх рэспублік таксама былі крыніцамі беларускай Дэкларацыі.

Абмеркаванне ўсіх артыкулаў Дэкларацыі выявіла шырокі спектр падыходаў да навейшай гісторыі Беларусі і перспектыў яе далейшага развіцця.

У прэамбуле Дэкларацыі не была замацавана прапанаваная дэпутатамі ад БНФ спасылка на «пераемнасць дзяржаўнай ідэі БССР ад Беларускай Народнай Рэспублікі і неабходнасць рэспубліканскай парламенцкай формы праўлення». Гэта тлумачылася тым, што ўсе пакаленні савецкіх людзей выхоўваліся на афіцыйнай канцэпцыі гісторыі БССР, якая абыходзіла ўвагай пазітыўную ролю БНР у гісторыі нашай краіны.

Дыскусія разгарнулася вакол тэрмінаў «абвяшчае» суверэнітэт альбо «пацвярджае». Было прапанавана запісаць «пацвярджае», каб падкрэсліць, што Беларусь у XX ст. ужо мела незалежнасць, што ідэя незалежнасці ўзнікла не сёння, што яна мае канкрэтныя ўвасабленні. Такі

падыход надаваў Дэкларацыі, да і самой ідэі дзяржаўнасці, гістарычны падмурак.

Пасля вострага абмеркавання Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была ўрачыста прынята Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 г.

У Дэкларацыі абвяшчалася, што Беларусь — «суверэнная дзяржава, якая ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народу ў вызначэнні свайго лёсу» (арт. 1).

Вышэйшай мэтай суверэнітэту прызнавалася забеспячэнне свабоднага развіцця і дабрабыту грамадзян рэспублікі.

Посьбітам суверэнітэту краіны і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады абвяшчаўся беларускі народ.

Як і любая іншая суверэнная дзяржава, Рэспублка Беларусь згодна з Дэкларацыяй мае свой герб, сцяг і гімн.

Дэкларацыя ўтрымлівала прававыя палажэнні па асноўных напрамках жыцця суверэннай Беларусі: уласнасць на тэрыторыю, арганізацыю сваёй фінансавай сістэмы, ваеннага будаўніцтва, юрыспрудэнцыі, адукацыі, вырашэнне пытанняў культуры і духоўнага развіцця беларускай нацыі і іншых нацыянальных супольнасцяў краіны і г.д.

Неабходна звярнуць увагу, што абвяшчэнне суверэнітэту не было накіравана на разрыў шматбаковых сувязяў з іншымі рэспублікамі. Наадварот, у канцы 1990 г. і пачатку 1991 г. былі паднісаны дагаворы аб супрацоўніцтве Беларусі ў розных сферах з Расіяй, Украінай і Казахстанам. Перазаключэнне дагавораў паміж рэспублікамі сведчыла аб ускосным юрыдычным прызнанні ўрадамі ўжо сувярэнных краін нядзейснасці саюзнага дагавора 1922 г.

Важнасць гэтага дакумента разумела падаўляючая большасць дэпутатаў тагачаснага Вярхоўнага Савета краіны, калі ў верасні 1991 г. прыняла рашэнне аб увядзенні агульнадзяржаўнага свята Рэспублікі Беларусь — Дня Незалежнасці — 27 ліпеня.

***Н.И. Лещинская***
МИУ (Минск)

# ЭТАПЫ РАЗВИТИЯ ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА О ПАССАЖИРСКОМ ТРАНСПОРТЕ ОБЩЕГО ПОЛЬЗОВАНИЯ

В отечественной юридической науке основы правового института пассажирского транспорта общего пользования были заложены еще в дореволюционный период. Все признаки транспорта общего пользования — его общедоступность и общедоступность информации о его деятельности, регулярность движения, наличие фиксированных тари-



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by